**Аўтызм. Дыягностыка і ранняе ўмяшанне.**

Статыстыка апошніх гадоў сведчыць аб павелічэнні колькасці дзяцей, якія трапляюць у катэгорыю аўтызму і аўтыстычнага спектра. На цяперашні час **колькасць выпадкаў складае 1:67**. Гэта вельмі вялікія лічбы, у шматлікіх краінах такі стан рэчаў параўноўваюць з новай эпідэміяй.

**Аўтызм** – гэта змены ў час развіцця чалавека, якія характарызуюцца якаснымі адхіленнямі ў сацыяльных узаемадзеяннях, кагнітыўных функцыях і абмежаваных інтарэсах, стэрыятыпіях.

**Аўтыстычны спектр** – гэта спектр захворванняў, якія маюць агульнае паходжанне з аўтызмам, але адрозніваюцца ўзроўнем функцыянальных здольнасцей і перспектыў развіцця.

Апошнія клінічныя даследванні пацвярджаюць адсутнасць фармакалагічных прэпаратаў, якія здольны вылечыць аўтызм. Менавіта таму, **не існуе таблеткі ад аўтызму!** Асноўным з'яўляецца псіхолага-педагагічнае ўмяшанне з улікам медыкаментознага суправаджэння.

Ва ўзросце да 3-х гадоў нервовая сістэма і псіхіка чалавека яшчэ знаходзіцца на стадыі фарміравання, працэсы нервовай сістэмы пластычны. Аднак, успрыняцце чалавека з аўтызмам зменена, сенсорныя імпульсы апрацоўваюцца не так, як у іх аднагодак і не так, як у дзяцей з аднолькавым дыягназам. **Варта ведаць, што адбываецца з дзіцем, каб не нашкодзіць яму.**

**Дакладныя прычыны з'яўлення аўтызму не вылучаны**. Такое становішча стварае спрыяльныя ўмовы для з'яўлення памылак у разуменні таго, што адбываецца з дзіцем. У перыядзе да 3-х гадоў складана выставіць дыягназ аўтызм, аднак першыя трывожныя моманты можна заўважыць ужо ва ўзросце 8-мі месяцаў. Таму існуе такое паняцце як "група рызыкі аўтыстычнага спектра". Дадзены накірунак ставіць задачу прадухіліць развіццё аўтыстычных праяў, павялічыць шанец дзяцей ранняга ўзросту на далейшае самастойнае і незалежнае дарослае жыццё.

**Каб пазбегнуць памылак і не згубіць спрыяльны перыяд для ўмяшання (узрост да 3-х гадоў)** бацькам варта звярнуць увагу на наступныя асаблівасці ў паводзінах дзіцяці:

- ✓ Не адклікаецца на сваё імя, паводзіць сябе нібыта глухое.
- ✓ Мае абмежаваныя зацікаўленасці і аднолькавасць у дзеянні.
- ✓ Нібыта знаходзіцца "само ў сабе".
- ✓ Не глядзіць у вочы, няма зрокавага кантакту (хутка адводзіць позірк, позірк складана злавіць, погляд скрозь прадметы\чалавека).
- ✓ Успрымае людзей як прадметы (лезе па людзях, выкарыстоўвае рукі іншых дзеля дасягнення пэўных мэт і г.д.).
- ✓ Не цікавіцца цацкамі альбо гуляе з імі "неяк не так" (выстаўляе шэрагі з цацак, круціць колы і дэталі канструктара, замест таго каб катаць і будаваць).
- ✓ Не любіць, не гуляе ў сумесныя гульні з дарослымі і дзецьмі, не пераймае.
- ✓ Можа без мэты рухацца па пакоі, не засяроджвае ўвагі на навакольных прадметах.
- ✓ Спецыфічна рэагуе на гукі, пахі, святло, смак, колеры, фізічныя актыўнасці (альбо вельмі канцэнтруецца, альбо поўнасцю ігнаруе).

- ✓ Не прызнае змены раскладу ў звычайным плане. Негатыўна рэагуе на ўмяшанне ў сваю дзейнасць альбо змяненне плана гульні. Настойліва крочыць па адной і той жа дарозе. Прытрымліваецца адных і тых жа рытуалаў у гульні.
- ✓ Адстае ў моўным развіцці: словы нібыта ні на каго не накіраваны. Паўтарае выразы, якія раней пачуў ад іншых людзей з фільмаў і мультфільмаў. Кажа пра сябе ў трэцяй асобе.

Калі некаторыя з прыведзеных пунктаў уласцівыя вашаму дзіцяці, то звярніцеся да спецыялістаў-прафесіяналаў у гэтай сферы: псіхіятр, псіхолаг, лагапед, неўролаг.

УЗ “15-я городская детская поликлиника” психолог районного центра раннего вмешательства Богуцкий И.О.